# ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 1 (100)




Героі

## Высокая ўзнагарода

**Старшы лейтэнант Яўген Панамарэнка, які летась выратаваў падчас пажару двух чалавек, атрымаў з рук міністра абароны Беларусі генерал-маёра Віктара Хрэніна медаль «За адзнаку ў папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый». Пра гэта паведаміла прэс-служба абароннага ведамства.**



Пажар у пасёлку Новаколасава здарыўся 28 сакавіка. Загарэлася кватэра на другім паверсе двухпавярховага шматкватэрнага жылога дома каля вайсковай часці. Старшы лейтэнант Яўген Панамарэнка арганізаваў ліквідацыю полымя і эвакуацыю людзей. Ён абвясціў трывогу пажарнаму нараду, сам жа пайшоў у кватэру, дзе здарыўся пажар, вынес адтуль пацярпелага мужчыну без прытомнасці, а з суседняй кватэры, напоўненай дымам, — дзіця.

Ратавальнікі прыбылі неўзабаве. На месцы падзей ужо працаваў асабовы склад ваеннай каманды проціпажарнай абароны і аварыйна-выратавальных работ. Ад аўтацыстэрны яны падалі пажарны ствол на тушэнне.

Навука

## У маладых талентаў — сур'ёзныя напрацоўкі

**Дваццаць шостага студзеня ў краіне будзе адзначацца Дзень беларускай навукі. Новыя распрацоўкі з'яўляюцца як у звыклых грамадзянскіх вышэйшых навучальных установах, так і ў сілавых. Напрыклад, у Ваеннай акадэміі Беларусі лаўрэатамі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі сёлета сталі два курсанты.**

Адзін з іх — старшына чацвёртага курса агульнавайсковага факультэта Дзяніс Домась. Яго навуковая работа прысвечана метадам барацьбы мотастралковага аддзялення з танкавымі разлікамі ўмоўнага праціўніка.

— Вучобу і пасаду старшыны сумяшчаць даволі складана, — кажа курсант. — Але ў нас вельмі добра арганізаваны расклад па часе, таму асаблівых цяжкасцяў падчас падрыхтоўкі навуковай работы ў мяне не ўзнікла. Але на ўсё спатрэбілася дзесьці з паўгода. Я вывучаў досвед, атрыманы падчас Вялікай Айчыннай вайны, канфліктаў апошніх дзесяцігоддзяў...

Дзяніс займаўся прыкладной навуковай дзейнасцю яшчэ з другога курса. Тады ён шукаў варыянты, як удасканаліць баявую машыну пяхоты, якім узбраеннем аснасціць мотастралковае падраздзяленне. Гэтым жа разам яму давялося яшчэ і павышаць свае веды ў англійскай мове — для навуковай работы выкарыстоўваліся замежныя ваенныя часопісы.

— Але ў ад'юнктуру я паступаць пакуль не думаю. Хоць хто ведае — можа, атрыманы пасля выпуску ўласны практычны досвед паслужыць базай для будучых навуковых распрацовак. Пакажа час.

Яўгенія Лявікіна, якая таксама стала лаўрэатам Спецыяльнага фонда Прэзідэнта, вучыцца на трэцім курсе авіяцыйнага факультэта. Дзяўчына — будучы бортінжынер. Але яе вельмі захапляе матэматыка. Так, тэмай навуковай работы стала дыскрэтнае пераўтварэнне Фур'е ў вылічальных машынах. Прашу растлумачыць, што ж гэта такое.

— Яно дазваляе паскорыць работу вылічальных комплексаў. Распрацоўка тэмы заняла семестр. Фактычна яна была прапрацавана мной з нуля. Займацца ёй было не столькі складана, колькі цікава. Але каб стаць лаўрэатам, мала мець абароненую навуковую работу, якая мае істотнае значэнне. Трэба яшчэ, каб на працягу навучання ўсе адзнакі не былі ніжэйшыя за 9.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Аты-баты

## Пачаліся заняткі па баявой гатоўнасці

**З 21 студзеня ва Узброеных Сілах пачаліся заняткі па баявой гатоўнасці. Мерапрыемствы праводзяцца ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі Узброеных Сіл па прызначэнні ў бягучым навучальным годзе. Пра гэта паведамляе прэс-служба Міністэрства абароны Беларусі.**

Заняткі з'яўляюцца адным з этапаў мерапрыемстваў па падтрыманні баявой гатоўнасці. Іх агульная скіраванасць — шматпланавая. Заключаецца яна ва ўдакладненні парадку дзеянняў вайскоўцаў у ходзе правядзення комплексу паслядоўных трэніровак з падраздзяленнямі, воінскімі часцямі, злучэннямі, органамі ваеннага кіравання па арганізаваным выкананні мерапрыемстваў ва ўмовах пераходу з мірнага на ваенны час.

Мэтамі заняткаў заяўлены падтрыманне баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці органаў ваеннага кіравання, аб'яднанняў, злучэнняў, воінскіх часцей на патрэбным узроўні, удасканаленне метадычных навыкаў, павышэнне тэарэтычных ведаў і практычных уменняў камандзіраў.

Асноўныя намаганні падчас падрыхтоўкі будуць сканцэнтраваны на забеспячэнні ваеннай бяспекі Рэспублікі Беларусь, эфектыўным прымяненні ўсіх элементаў яе ваеннай арганізацыі на падставе ўсебаковай ацэнкі і прагнозу развіцця ваенна-палітычнай і стратэгічнай абстаноўкі вакол нашай краіны.

Спецыяльны рэпартаж

# ЯК ДАСЯГАЕЦЦА БЯСПЕКА ПАЛЁТАЎ?

### Карэспандэнты «Звязды» наведалі 50-ю змешаную авіябазу

**ГАЛОЎНЫ кампанент любога палёту — яго бяспечнасць. Верталёт і самалёт — гэта не аўтамабіль. Калі падчас знаходжання ў паветры ўзнікне нейкая няспраўнасць, то магчымасць своечасова сесці на свой аэрадром ёсць далёка не заўжды. Не кажучы ўжо пра мінімальную шкоду не толькі для экіпажа, але і для жыхароў населеных пунктаў ды інфраструктуры. Менавіта таму ў камандаванні Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны адбылася канферэнцыя па бяспецы палётаў авіяцыі Узброеных Сіл Беларусі, скіраваная на вырашэнне праблемных пытанняў і ўдасканаленне асноўных кірункаў работы датычна аварыйнасці ў авіяцыі. А практычныя заняткі прайшлі на тэрыторыі 50-й змешанай авіяцыйнай базы ў Мачулішчах.**

— Па выніках мінулага навучальнага года мы сталі найлепшай вайсковай часцю ў Беларусі, — зазначае **камандзір авіябазы, ваенны лётчык-снайпер палкоўнік Андрэй ЛУК'ЯНОВІЧ.** — Атрымалі з гэтай нагоды пераходзячы вымпел. Але займець такі трафей, скажам прама, было вельмі складана. Сярод іншага, мы штодня забяспечвалі баявое дзяжурства, удзельнічалі ў сумесным аператыўным вучэнні. Падлічылі, што агулам у паветры мы правялі больш за чатыры тысячы гадзін! І вельмі прыемна, што нашы экіпажы заваявалі летась на Армейскіх гульнях два камплекты ўзнагарод у конкурсе «Авіядартс». «Золата» здабылі экіпажы на новых верталётах Мі-8МТВ5, а «серабро» — на Мі-24.



Паняцце бяспекі палётаў вельмі шырокае. Але ў рэшце рэшт яно зводзіцца да трох складнікаў: кваліфікацыі экіпажа, стану авіяцыйнай тэхнікі і сітуацыі ў навакольным асяроддзі.

— Статыстыка авіяцыйных здарэнняў вядзецца ўжо больш за 80 гадоў, — працягвае Андрэй Лук'яновіч. — І няўмольныя лічбы сведчаць, што больш за 60 % іх прыпадае на долю чалавечага фактару. Для звядзення да мінімуму яго ўплыву на бяспеку палётаў асаблівая ўвага ўдзяляецца павышэнню кваліфікацыі авіяперсаналу. Хачу адзначыць, што ў нас у Ваеннай акадэміі створана ўласная школа маладых экіпажаў, дзе будучыя ваенныя лётчыкі праходзяць поўны курс навучання. Падчас стажыроўкі курсантаў авіяцыйнага факультэта «ставяць на крыло» самыя падрыхтаваныя лётчыкі авіяцыйнай базы. Як вынік, пасля выпуску да нас прыходзіць новае папаўненне, якое мае добрую аснову для далейшага ўдасканалення лётнага майстэрства.

Перш чым сесці за штурвал, будучыя пілоты праводзяць не адзін дзясятак гадзін на трэнажорах. Для кожнага тыпу паветранага судна яны розныя. Усё пачынаецца са знаёмай сітуацыі — уявіце сабе, што вы кіруеце верталётам падчас камп'ютарнай гульні. Толькі тут праграма будзе рэгістраваць усе вашы памылкі. Больш складаны ўзровень — перасесці ў кабіну сапраўднага верталёта і кіраваць палётам ужо адтуль. Ілюзію таго, што насамрэч адбываецца палёт, стварае адмысловы панарамны экран. Віртуальныя пейзажы змяняюцца рэальнымі толькі пры ўмове бездакорнай здачы ўсіх іспытаў.

— Колькі часу трэба для падрыхтоўкі, каб стаць кваліфікаваным лётчыкам? — задаецца пытаннем **камандзір верталёта Мі-8 Сяргей АНДРОПАЎ**. — Насамрэч падрыхтоўка доўжыцца ўсё жыццё. Вось паглядзіце — нават зараз у мяне ў кішэнях ручкі, алоўкі, нататнікі... Неяк мы падлічылі, колькі трэба грошай, каб падрыхтаваць лётчыка першага класа. Атрымалася вельмі і вельмі шмат. Трэнажор жа дазваляе ўбачыць пэўныя памылкі ў лётчыка на зямлі і пазбавіцца ад іх. Па-першае, эканомяцца грошы і матарэсурс тэхнікі, а па-другое, гэта таксама ўнёсак у бяспечнасць палётаў. Тут усе дзеянні даводзяцца ледзь не да аўтаматызму. Бывае, што адлік часу ідзе на секунды, і лётчык у такім разе мусіць ведаць, як дзейнічаць у такой вострай сітуацыі. Асабліва калі нешта адбылося з самой тэхнікай.

— Па сутнасці, трэнажор — гэта вылічальны мадэлюючы комплекс, прызначаны для імітацыі палёту канкрэтнага лятальнага апарата, — тлумачыць **начальнік комплекснага трэнажора 50-й змешанай авіяцыйнай базы маёр Сяргей ПАДУЗДЗІКАЎ.** — Ён імітуе работу сілавых установак, бартавога абсталявання, фізічныя ўмовы палёту і асаблівых выпадкаў, якія могуць узнікаць у паветры. Уся інфармацыя выводзіцца на маніторы, па якіх і можна кантраляваць увесь працэс з прагонам магчымых сітуацый. На жаль, пакуль у свеце не існуе ўніверсальных трэнажораў, якія могуць мадэляваць некалькі лятальных апаратаў. Усе яны абсалютна розныя па канструкцыі.


### ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

Летась у 50-й змешанай авіяцыйнай базе быў адкрыты мемарыял у гонар тых вайскоўцаў, што загінулі на баявым пасту. Падчас нясення службы ў Афганістане іх колькасць дасягнула 132 чалавек. У 1983 годзе часці ўручылі Ордэн Чырвонага Сцяга за выкананне інтэрнацыянальнага доўгу. На рахунку яе вайскоўцаў — больш за чатыры тысячы ўрадавых узнагарод. У спісах — дзевяць Герояў Савецкага Саюза.

Падчас збору архіўнай інфармацыі выявілася адметнае супадзенне. Удалося знайсці дакументы, якія сведчылі, што аэрадром пад Мінскам быў створаны 3 ліпеня 1937 года. Вось так і атрымалася, што ваенныя лётчыкі адначасова адзначаюць не толькі Дзень Незалежнасці, але і чарговую гадавіну стварэння аэрадрома.






Падчас змены перад выкананнем палётаў увесь персанал праходзіць праз медыцынскі агляд.



— Пытаемся, ці ёсць скаргі, колькі гадзін лётчык спаў, чым харчаваўся, вымяраем ціск, пульс, тэмпературу цела, — кажа **ўрач па пошукава-выратавальным забеспячэнні, старшы лейтэнант медыцынскай службы Яўген КУНЕВІЧ.** — Пры неабходнасці можам праверыць стан вушэй і горла, каб выключыць сімптомы, звязаныя з дэкампрэсіяй на вялікіх вышынях. Калі там адбудзецца разгерметызацыя, то адбываецца рэзкі перапад бараметрычнага ціску. Ад гэтага можа ўзнікнуць моцны болевы сіндром, што знізіць працаздольнасць лётчыка. У лётнага складу павінны быць вылечаны зубы, з сімптомамі прастуды мы таксама не можам нікога дапусціць да вылету. Адным словам, лётчык мусіць загадзя добра адпачыць, быць здаровым і з добрым настроем.

Побач з урачом — **авіяцыйны псіхолаг старшы прапаршчык Аксана КІСЕЛЬ.**

— Спецыяльны прыбор вызначае рэакцыю на аб'ект, які рухаецца, а менавіта — спрытнасць і хуткасць. Ёсць методыкі, якія дазваляюць развіць вобразнае мысленне. Напрыклад, сумясціць выразы, патрэніраваць вакамер. Даволі цікавае заданне — рашыць простую матэматычную задачку на логіку.

Увогуле працэдура падрыхтоўкі да пачатку лётнай змены даволі складаная і займае некалькі гадзін. Інжынерна-тэхнічны персанал рыхтуе авіяцыйную тэхніку, падраздзяленні забеспячэння выконваюць падрыхтоўку аэрадрома і ўзлётна-пасадачнай паласы.

Харчавацца лётчыкі могуць толькі ў сталоўцы, для іх вытрымліваецца асобнае меню.

За дзве гадзіны пачынаецца паветраная разведка надвор'я. Самалёт-разведчык удакладняе звесткі ад метэаслужбы на прадмет палётнай бачнасці, краю воблачнасці, правярае стан радыётэхнічных сістэм пасадкі, самой паласы. Затым экіпажы збіраюцца на перадпалётныя ўказанні. Там камандзір ставіць задачу і заслухоўвае ўсіх адказных за правядзенне лётнай змены асоб. Разведчык надвор'я дакладвае сінаптычную абстаноўку. Штурман расказвае, па якіх маршрутах будуць адбывацца палёты і як пройдзе заход на пасадку. Вызначаюцца ўзлётна-пасадачны курс, запасныя аэрадромы. І толькі калі ўсё выканана, гучыць каманда «Па самалётах!».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**



Профі

# З-ПАД ЗЯМЛІ ДАСТАЦЬ

**Хоць апошнія баі Вялікай Айчыннай вайны адгрымелі на нашай зямлі 75 гадоў таму, яшчэ і дагэтуль яны нагадваюць пра сябе смяротнымі «сюрпрызамі» ў зямлі. На рахунку інжынерных войскаў — звыш 11 з паловай тысяч абясшкоджаных летась выбухованебяспечных прадметаў. А гэта больш чым па трыццаць штук за дзень.**

Як бачым, нашым сапёрам адпачываць няма калі. І больш за тое, ім трэба пастаянна вучыцца сваёй справе, бо стаўка пры памылковых дзеяннях вельмі высокая. Менавіта таму на базе 2-й інжынернай брыгады прайшоў адмысловы збор па размініраванні. Туды з'ехаліся начальнікі інжынерных службаў, камандзіры воінскіх часцей, дзе ёсць перасоўныя групы размініравання, а таксама кіраўнікі гэтых груп.

— Збор праводзіўся на працягу трох дзён, — паведаміў **начальнік інжынерных войск Узброеных Сіл Андрэй КУРАКОЎ.** — У першы з іх вайскоўцы наведалі тэарэтычныя заняткі, дзе паўтаралі асноўныя моманты, неабходныя падчас службы. Другі ж дзень стаў практычным і праводзіўся на палігоне брыгады непадалёк ад Мінска. На невялікім участку дэманстравалася разведка мясцовасці на наяўнасць выбухованебяспечных прадметаў, то-бок праверка, як камандзір групы арганізоўвае гэты працэс. Пасля яго змяніла суцэльная ачыстка мясцовасці ад выбухованебяспечных прадметаў. У чым розніца? Разведка праводзіцца тады, калі ёсць дакладныя звесткі пра тое, што менавіта ў гэтым раёне як быццам нешта ёсць. Калі інфармацыя пацвярджаецца, то арганізоўваецца суцэльная ачыстка. Але яна патрабуе значна большых рэсурсаў як па часе, так і па задзейнічанні асабовага складу.

Летась ачысткай тэрыторыі Беларусі ад снарадаў, гранат, мін, бомбаў, акрамя ўнутраных войскаў, займалася 28 перасоўных груп размініравання, падрыхтаваных у 13 злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл. Яны выканалі 456 заявак ваенных камісарыятаў на абясшкоджванне небяспечных знаходак, якіх было амаль дзве з паловай тысячы. Прычым 90 % з іх адносіліся да катэгорыі тэрміновых.

Але адкуль жа ўзялася розніца прыблізна ў дзевяць тысяч? Справа ў тым, што гэтая колькасць знойдзеных боеприпасаў прыпадае на Докшыцкі раён. Непадалёк ад станцыі Круляўшчызна немцы пры адступленні падарвалі збройны склад. Але яго «начынка» не столькі ўзарвалася проста на месцы, колькі разляцелася па навакольнай мясцовасці. Работы па пошуку неразарваных боепрыпасаў і іх абясшкоджванні запланаваны і на 2020 год.

— Зямля наша літаральна нашпігавана снарадамі, бомбамі, гранатамі не толькі з часоў Другой, але і з Першай сусветнай вайны. Колькасць таго, што мы з кожным годам вывозім на палігоны і падрываем, істотна не змяншаецца. Калі мы цалкам ачысцім лясы і палі Беларусі ад «рэха вайны» — вельмі цяжка сказаць. Але ніводная еўрапейская краіна не прыняла на сябе столькі смертаноснага металу, як наша.



Фота БелТА.

Вайскоўцы і паказалі на палігоне, як яны знішчаюць такія смертаносныя прадметы. Прычым існуе некалькі спосабаў. Першы, і ён жа даўно асвоены, — гэта кантраляваны падрыў. Снарад ці бомба часоў Вялікай Айчыннай узрываецца дзякуючы дэтанацыі ад падрыву размешчанага побач з імі зарада. Гучыць каманда «Агонь» — і праз долю секунды раздаецца выбух. Толькі чорны дым зносіць у бок лесу... Але нашы інжынерныя войскі асвоілі выкарыстанне так званага блакіратара выбуху. Гэтая прылада прызначана для таго, каб максімальна паглынуць энергію выбуху без утварэння асколкаў. А рэшта энергіі перанакіроўваецца ў строга вызначаны бок. У нашым выпадку — вертыкальна ўверх і ўніз. Гэтыя напрамкі лічацца максімальна бяспечныя непасрэдна для саміх удзельнікаў перасоўных груп размініравання. Летась іх аснасцілі новымі проціасколкавымі касцюмамі, набылі самыя сучасныя мінашукальнікі. У асноўным яны аўстрыйскай і амерыканскай вытворчасці.

— Перад вамі два касцюмы — не толькі проціаскепкавы, але і процівыбуховы, — расказвае **начальнік цыкла проціміннага цэнтра Узброеных Сіл Міхаіл КАНДРАЦЬЕЎ.** — Пра яго хочацца расказаць падрабязней. Наш даспех даволі цяжкі, ён важыць у зборы ажно 64 кілаграмы. Фізічна знаходзіцца ў ім няпроста. Але разлічаны на тое, каб зберагчы жыццё. Ён вытрымлівае падрыў за паўтара метра ад сябе паўтара кілаграмаў трацілу ў металічнай абалонцы таўшчынёй некалькі міліметраў. Яго задача — мінімізаваць уздзеянне выбуховай хвалі. Гэта стала магчыма дзякуючы выкарыстанню адмысловых бранявых накладак. Упор, натуральна, робіцца на франтальную частку. Знаходзіцца ў такім касцюме можна не больш за 15 хвілін. Каб яго адзець, патрэбны два чалавекі. Таксама ў склад касцюма ўваходзіць шлем з магчымасцю радыёсувязі і паветранай вентыляцыяй. У камплекце да яго дадаецца гідрафобная нацельная бялізна. Сам касцюм ахалоджваецца пры дапамозе вады.

Уся гэтая работа праароблена ўнутры краіны. Але якія вынікі паказваюць нашы інжынерныя войскі на міжнародных зборах і спаборніцтвах?

— Летась мы прымалі ў Гродне на базе 557-й брыгады Заходняга аператыўнага камандавання падраздзяленні з Расіі, Кыргызстана, — згадвае Андрэй Куракоў. — Збор праходзіў вельмі інтэнсіўна і завяршыўся сумесным тактыка-спецыялізаваным вучэннем. Акрамя таго, сумеснае вучэнне прайшло на палігоне ў Муліне, які месціцца ў Ніжагародскай вобласці Расіі. Падчас вучэння «Шчыт Саюза—2019» было абсталявана больш за тысячу фартыфікацыйных збудаванняў, дзясяткі кіламетраў маршрутаў перасоўвання войск, больш за паўтара кіламетра інжынерных забудоў. Адпрацоўвалі праход праз мінныя палі праціўніка з прымяненнем установак размініравання. І чарговы раз даказалі сваю здольнасць сумесна выконваць задачы.

2020 год абяцае быць не менш насычаны. Апроч іншага, у Магілёве мяркуецца правесці збор пантонных падраздзяленняў, які скончыцца тактыка-спецыялізаваным вучэннем.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**